Газета складаецца з **кароткіх** і **жыва** напісаных матэрыялаў — з такім разлікам, каб стомлены працаўнік змог усю яе прачытаць прыкладна за гадзіну. **Перадавіца** падаецца ў выглядзе сардэчнай, шчырай гаворкі, можа, нават ад імя канкрэтнай асобы, аб самым надзённым у дадзены момант і ў дадзенай мясцовасці. **Выступленні** палітычных дзеячаў, **прамовы** кіраўнікоў, афіцыйныя **дакументы** ідуць у простым і ясным выкладанні, якое адзначае толькі самае галоўнае, новае. З нумара ў нумар змяшчаецца аператыўная і разнастайная (палітычная, эканамічная, прафесійная, эстэтычная, даведачная і інш.) **інфармацыя**. Буйнейшыя **міжнародныя падзеі** перыядычна асвятляюцца ў талковых аглядах і «калонках каментатара». **Прапаганда** прыкладных ведаў і жыццёвай вопытнасці, навуковых метадаў работы і дасягненняў майстроў справы вядзецца ў пастаяннай рубрыцы «Трыбуна перадавіка». **Крытычны аналіз** становішча на месцах робіцца ў смелых і грунтоўных карэспандэнцыях і артыкулах спецыялістаў, партыйных і савецкіх работнікаў, журналістаў. Рэгулярна друкуюцца папулярныя «Гутаркі аб выхаванні» (дзяцей і моладзі), «Парады гаспадару (гаспадыні)» (пра асабістае жыццё, побыт, добраўпарадкаванне і г. д.) — для **сямейнага** чытання. У нядзельным нумары пажаданы цікавы нарыс або апавяданне, фельетон ці гумарэска, нават раёшнік (з казкамі, рэбусамі, загадкамі, народнымі прыкметамі) — для **адпачынку**. Ну і абавязкова павінны быць **рэклама, аб'явы.**

Вядома, магчымы варыянты, але галоўнае заключаецца ў тым, што **свая** газета, якая была б надзейным памочнікам партыйных і савецкіх органаў, з якімі яна адной справай занятая і б'е ў адну кропку. Газета, якая выдаецца ў раёне, не можа быць копіяй ні цэнтральнай, ні абласной. Няхай яна раўняецца на іх, вучыцца ў іх, пераймае іх вопыт — гэта звычайная рэч, але няхай будзе раённай у самым лепшым сэнсе гэтага слова. І другое: каб быць на вышыні прынцыповых патрабаванняў, якія загучалі па-новаму ва ўмовах перабудовы, «раёнцы» трэба няўхільна імкнуцца да тэматычнай разнастайнасці, без баязлівасці, без аглядкі на «начальства» брацца за «балючыя», «вострыя» пытанні, рашуча пераходзіць ад інфармацыйнасці і канстатавання да аналітычнасці і канструктыўнасці, адмаўляцца ад параднасці і алілуйшчыны, рабіць праўду законам свайго жыцця, нястомна, мужна дамагацца дзейснасці і эфектыўнасці публікацый. Зразумела, пры гэтым прыдзецца ўзняць літаратурны ўзровень творчасці, пашырыць жанравы набор.

Няма сумнення, што такую газету падпісчыкі будуць чакаць і разгортваць з нецярпеннем: «А што сёння пішуць пра нас і для нас?» Такая газета будзе сапраўдным сябрам і дарадцам чалавека працы, які з'яўляецца прарабам перабудовы.

[1] КПСС о средствах массовой информации и пропаганды. М., 1979. С. 58.
[2] Там жа. С. 288.
[3] Там жа. С. 173.
[4] Гл.: Там жа. С. 216.
[5] Гл.: Там жа. С. 56—57; 60—61; 289.

Б. В. СТРАЛЬЦОЎ

## РАЁННАЯ ГАЗЕТА Ў СІСТЭМЕ КІРАВАННЯ

Прыярытэтныя напрамкі і спецыфіка дзейнасці раённага друку дакладна вызначаны пры яго стварэнні і зафіксаваны ў пастанове ЦК ВКП(б) «Аб рэарганізацыі сеткі газет у сувязі з ліквідацыяй акруг» (11 жніўня 1930 года): «Раённая газета павінна быць масавым палітычным органам і павінна мець яскрава праяўлены вытворчы характар (у адпаведнасці з эканомікай пэўнага раёна)»[1]. З гэтага недвухсэнсава вынікае, што раённая газета ад самага пачатку ўключалася ў палітычную сістэму кіравання сваім рэгіёнам, станавілася неад'емнай часткай гэтай сістэмы.

За дзесяцігоддзі, што мінулі ад моманту заснавання нізавога звяна партыйна-савецкага друку, кіраўніцкая функцыя раённай газеты, гэтак жа як і іншых сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды, выразна акрэслілася і праявілася па ўсім дыяпазоне ленінскай трыяды: «Газета — не толькі калектыўны прапагандыст і калектыўны агітатар, але таксама і калектыўны арганізатар»[2]. Аднак было ў гэтай справе і істотнае абмежаванне. Існавала афіцыйная ўстаноўка, згодна якой сродкі масавай інфар-

мацыі і прапаганды дзейнічаюць строга ў рэчышчы дырэктыўных праграм, распрацаваных вядучымі сацыяльнымі інстытутамі кіравання — партыйнымі і дзяржаўнымі органамі. Гэта ўстаноўка ажыццяўлялася на практыцы і абгрунтоўвалася ў журналісцкай тэарэтычнай літаратуры [3]. Такім чынам, прэсе адводзілася дапаможная роля. Калі гэта абласная газета, то яна выконвае дырэктыўныя праграмы абкома партыі і аблвыканкома; калі раённая (аб'яднаная), то дзейнічае ў напрамках, вызначаных райкомам (гаркомам і райкомам) і выканкомам райсавета (выканкомамі гарсавета і райсавета).

Устаноўка ўвогуле правільная. Орган партыйнага камітэта і савецкай улады павінен праводзіць іх палітычную лінію. Бясспрэчна, што ўзровень партыйнага кіраўніцтва газетамі з'яўляецца адным з важнейшых фактараў іх эфектыўнасці і дзейнасці. Аднак пры прамалінейным разуменні правільная ўстаноўка ператваралася ў фактар, які стрымліваў творчую ініцыятыву. Журналісты ва ўсім і заўсёды пачалі чакаць дырэктыўных указанняў «зверху». Не толькі па галоўных напрамках дзейнасці, але і па канкрэтнай, разавай тэматыцы. Склалася ненармальная сітуацыя: газета з'яўляецца арганічнай часткай сістэмы кіравання пэўным рэгіёнам, журналісцкі калектыў у сувязі з гэтым павінен спецыфічным чынам ажыццяўляць кіраўніцкія функцыі, але робіць гэта ён толькі апасродкавана, з'яўляючыся, па сутнасці, не творчым кіраўніцкім апаратам, а пераважна ідэалагічным інструментам, з дапамогай якога дэкларуецца агульная палітычная лінія, ажыццяўляецца і фіксуецца выкананне адпаведных дырэктыў рэгіянальных органаў. Вядома, журналісты дэталізуюць агульныя дырэктыўныя ўказанні, вызначаюць адпаведную праблематыку выступленняў, вядуць распрацоўку тэм, абапіраючыся на канкрэтныя сітуацыі і факты. Аднак ва ўсім гэтым яскрава праяўляецца работа толькі «памагатых», а не раўнапраўных членаў кіраўніцкага апарату. Дарэчы, разуменне ролі журналістаў, як «памагатых», «прывадных пасаў» партыйных камітэтаў, фіксавалася і ў афіцыйных дакументах агульнадзяржаўнага маштабу.

XXVII з'езд КПСС унёс у гэтае пытанне дастатковую яснасць, адзначыўшы, што цяпер «яшчэ большую значнасць набывае дзейснасць сродкаў масавай інфармацыі. Цэнтральны Камітэт бачыць у іх інструмент стварэння...»[4]. Дзейснасць жа з'яўляецца канкрэтным праяўленнем спецыфічна кіраўніцкай функцыі СМІП. На наступных пленумах ЦК і сустрэчах з журналістамі ў Цэнтральным Камітэце КПСС гэты тэзіс знайшоў далейшае абгрунтаванне і дэталізацыю. Сродкам масавай інфармацыі, у першую чаргу газетам, у тым ліку і мясцовым, належыць выпрацоўваць сістэмны падыход пры адлюстраванні рэчаіснасці, забяспечваць самую шырокую публічнасць перабудовы, смела заглядаць у будучыню, раіцца з масамі і падтрымліваць іх ініцыятыву. Гаворка цяпер ідзе не толькі аб падначаленні, але і аб партнёрскім узаемадзеянні сродкаў масавай інфармацыі з партыйнымі камітэтамі. На нарадзе з работнікамі СМІП у ЦК Кампартыі Беларусі, напрыклад, было прызнана, што зараз, як ніколі раней, «важна разглядаць работу друку, радыё і тэлебачання як частку ўсёй ідэалагічнай работы партыі, частку агульнапартыйнай справы, ад якой у многім залежаць тэмпы і вынікі перабудовы»[5].

Напачатку пераасэнсаванне свайго месца ў ажыццяўленні агульнапартыйнай справы, у перабудове засведчыў рэспубліканскі друк. За ім пачалі падцягвацца абласныя газеты. Першыя крокі ў вызначаным напрамку зрабіла і раённая перыёдыка, якая ў тым, што датычыцца ўласнай ініцыятывы і самастойнасці, была дасюль самым кансерватыўным звяном сістэмы СМІП.

На старонках жлобінскай аб'яднанай газеты «Камуніст» з'явілася новая рубрыка — «Да пленума гаркома КПБ». Калі раней газета абмяжоўвалася традыцыйнымі справаздачамі з пленумаў гарадскога камітэта партыі, то цяпер яна прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да іх. 20 кастрычніка 1987 года газета апублікавала калектыўнае інтэрв'ю «Абапірацца на калектыў». Карэспандэнт звярнуўся да членаў партарганізацыі доследнага рамонтна-механічнага завода з прапановай адказаць на пытанне: ці мяняюцца адпаведна з патрабаваннямі часу стыль, формы і метады работы партыйнай арганізацыі і як ёй дапамагае ў перабудове гарком партыі? У наступным нумары «Камуніста» з'явілася яшчэ адна публікацыя пад рубрыкай «Да пленума гаркома КПБ», у якой ішла гаворка пра перабудову работы Саветаў народных дэпутатаў, пра інерцыю старога стылю ў дзейнасці сельскіх і пасялковых выканкомаў.

Рубрыку «Да пленума райкома КПБ» увяла рэдакцыя гомельскай раённай газеты «Маяк». І тут відавочная праява дэмакратызацыі нашага жыцця — калектыўнае інтэрв'ю «Спрацоўвае новы механізм» (1987, 21 ліпеня), у якім спецыялісты і рабочыя Гомельскага маторарамонтнага завода сумесна абмяркоўваюць праблемы гаспадарчага разліку, прапануюць улічыць іх пазіцыю пры разглядзе гэтага пытання на пленуме. У наступнай публікацыі «Не спыняемся на паўмерах» (23 ліпеня) дыяпазон размовы пашыраецца: закранаюцца такія пытанні, як дэфіцыт кваліфікаваных кадраў, пралікі пры будаўніцтве новых вытворчых аб'ектаў, неабходнасць скарачэння кіраўніцкага апарату.

Каштоўнасць такога папярэдняга абмеркавання, удзелу ў падрыхтоўцы да пленумаў партыйных камітэтаў многіх камуністаў, а нярэдка і беспартыйных — відавочная. Тут — і выказванне калектыўнай думкі, і школа дэмакратыі ў дзеянні. Невыпадкова іншыя раённыя газеты ўзялі на ўзбраенне гэту новую рубрыку.

Адной з прэрагатыў кіраўніцкага апарату з'яўляецца кантрольная функцыя. Па-свойму, журналісцкімі сродкамі, ажыццяўляе яе і раённы друк. Але журналісцкі кантроль у гэтым звяне СМІП зарыентаваны выключна на «нізавыя» ячэйкі рэгіёна. Яго вынікі перыядычна даводзяцца да ведама чытачоў у выглядзе рэагаванняў на крытычныя публікацыі. Форма выпрабаваная, эфектыўная. Але не адзіная. Працэс шырокай публічнасці вымагае ад журналістаў пошуку новых форм кантрольна-публіцыстычнай дзейнасці.

Простую, але надзвычай дзейсную і выразную форму кантролю за рэалізацыяй крытычных заўваг і прапаноў, якія выказваюцца працоўнымі ў адрас кіруючых органаў, пачала прымяняць баранавіцкая аб'яднаная газета «Знамя коммунизма». Вось як гэта выглядае ў адной з канкрэтных сітуацый. На сесіі раённага Савета народных дэпутатаў, якая адбылася ў верасні 1987 года, разглядалася работа сельвыканкомаў, будаўнічых арганізацый, калгасаў і саўгасаў па выкананню праграмы жыллёвага будаўніцтва, добраўпарадкаванню населеных пунктаў, стварэнню ўмоў для паскоранага сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Дэпутаты выказалі крытычныя заўвагі раду кіруючых работнікаў раённых арганізацый, у тым ліку райвыканкома, адзначылі сур'ёзныя недахопы ў стылі і метадах работы яго аддзелаў, задалі шэраг складаных пытанняў. Найбольш сур'ёзныя пытанні і адказы тых людзей, ад каго залежыць вырашэнне справы, «Знамя коммунизма» змясціла 23 кастрычніка пад агульным загалоўкам «Было прапанавана. Што зроблена?» Журналісты ўзялі гэтыя пытанні пад кантроль і ў наступных нумарах паведамлялі чытачам аб іх вырашэнні або аналізавалі прычыны тармажэння пры рэалізацыі дэпутацкіх прапаноў.

Прыкметы абуджэння, пачатку актыўнага ўсведамлення журналістамі свайго месца і ролі ў сістэме кіравання відны і на старонках іншых мясцовых выданняў. Напрыклад, 16 ліпеня 1987 года светлагорская аб'яднаная газета «Агні камунізму» пад загалоўкам «Перабудова: нельга губляць час» апублікавала дыялог свайго карэспандэнта і загадчыка прамыслова-транспартнага аддзела гаркома партыі. Размова ідзе на роўных. Журналіст засведчвае сваю кампетэнтнасць у спецыфіцы пераходу прамысловых прадпрыемстваў на новыя метады гаспадарання, акцэнтуе ўвагу на тых напрамках партыйнага забеспячэння эканамічнай рэформы, якім, на яго погляд, работнікі гаркома не надаюць належнай увагі. Журналісцкай кампетэнтнасцю, завостранай скіраванасцю на дасягненне канкрэтных мэт вызначаецца і справаздача «Настойліва ўкараняць інтэнсіўныя тэхналогіі», якая заняла поўны разварот у нясвіжскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» (1987. 19 лістапада). Дарэчы, гэта справаздача аб уласным мерапрыемстве: супрацоўнікі нясвіжскай рэдакцыі сумесна з кіраўніцтвам РАПА правялі ў адным з калгасаў раёна «круглы стол», на які запрасілі старшынь калгасаў, дырэктараў саўгасаў і спецыялістаў іншых гаспадарак раёна, а таксама першага сакратара райкома партыі.

Новае ў мясцовым друку нараджаецца і зацвярджаецца нялёгка і няпроста. Тут больш учэпіста, чым у іншых СМІП, трымаюцца стэрэатыпы мінулых гадоў. У тым ліку і ў праяўленнях спецыфічна кіраўніцкай журналісцкай дзейнасці. Ёсць на гэта аб'ектыўныя прычыны — іх разгляду і аналізу варта прысвяціць асобнае даследаванне. Зараз жа важна вызначыць аснову — сацыяльны падмурак, на якім будзе адбывацца інтэнсіфікацыя кіраўніцкай дзейнасці мясцовага (і не толькі мясцовага) друку. Гэта — далейшая дэмакратызацыя савецкага ладу і ўсіх сфер нашага жыцця.

У. І. Ленін бачыў сацыялістычную дэмакратыю як працэс, які пранізвае ўсе пласты палітычнага, эканамічнага і грамадскага жыцця. Ён прыйшоў да фундаментальнага вываду, што «...дэмакратыя ёсць **таксама** дзяржава...»[6], гэта значыць асноўны інстытут палітычнай сістэмы, які ажыццяўляе кіраванне грамадствам, ахову яго эканамічнай і сацыяльнай структуры. Менавіта ў агульнанародным кіраванні дзяржавай, усімі справамі на розных паверхах палітычнай і дзяржаўнай улады — галоўная сутнасць сацыялістычнай дэмакратыі. Сваё права на ўдзел у кіраўніцтве працоўныя ажыццяўляюць і праз друк, удакладняючы планы, крытыкуючы няправільныя рашэнні, адабраючы разумную сацыяльна-эканамічную палітыку, прапануючы шляхі вырашэння тых або іншых пытанняў, праблемных сітуацый. Няма зараз сфер дзейнасці, аб'ектаў і пасад, забароненых для крытычнага аналізу.

[1] КПСС о средствах массовой информации и пропаганды. М., 1979. С. 146.
[2] Ленін У. І. Творы. Т. 5. С. 10.
[3] Гл.: Мастерство журналиста. М., 1977. С. 191.
[4] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск, 1986. С. 105.
[5] Звязда. 1987. 28 лістапада.
[6] Ленін У. І. Творы. Т. 25. С. 371.

О. Т. МАНАЕВ

# СОЦИАЛЬНО-ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ ФАКТОРЫ ЭФФЕКТИВНОСТИ ГОРОДСКОЙ ВЕЧЕРНЕЙ ГАЗЕТЫ

Начиная с 60-х годов все больший вес в структуре местной печати стали приобретать городские вечерние газеты. В 1987 году их тираж составил почти четверть городской прессы страны. С 1967 года такая газета стала издаваться и в столице Белоруссии. О роли «Вечернего Минска» («ВМ») в общественной жизни города говорит уже то, что за 20 лет его тираж увеличился более чем в 4 раза и составляет ныне 235 тыс. экз. Хотя по функциональным характеристикам вечерняя газета ближе к районной, чем, скажем, к областной или республиканской, она обладает ярко выраженной спецификой, определяющей эффективность ее взаимодействия с аудиторией. Определению специфики и путей повышения эффективности влияния газеты «Вечерний Минск» на свою аудиторию и посвящено оперативное исследование, проведенное недавно социологами Белгосуниверситета имени В. И. Ленина.

Сегодня почти каждая семья в Минске имеет возможность читать городскую вечернюю газету. Анкетный опрос показал, что почти две трети минчан читают «ВМ» уже свыше 5 лет, причем свыше 70 % — практически каждый номер[1]. Иными словами, большинство из них хорошо знает газету и может вполне квалифицированно высказать о ней свое мнение. Всего лишь 4,1 % опрошенных читают, главным образом, рекламу и объявления. Эти данные убедительно опровергают точку зрения, согласно которой вечерняя газета воспринимается прежде всего как своеобразный «рекламный листок» и читается только для того, чтобы узнать: что и где купить, когда и куда пойти развлечься. Три четверти опрошенных читают не все подряд, а только материалы тех разделов, которые их интересуют. Это говорит о весьма высокой дифференцированности аудитории «ВМ». Функциональная специфика вечерней газеты проявляется уже при анализе мотивов потребления ее сообщений. Так, если познавательный мотив («читаю, чтобы быть в курсе событий») является ведущим для аудитории любой газеты, то прагматический («читаю, чтобы получить информацию, нужную в работе, учебе, общественной жизни, быту») и гедонистический («читаю, чтобы отдохнуть, развлечься, заполнить свободное время») мотивы значимо отличают читателей «ВМ» от аудитории, например, республиканской печати. Второй мотив указали 56 % опрошенных (среди читателей республиканских газет — только 35,8 %), а третий — почти 35 % (среди читателей республиканских газет — менее 22 %)[2]. Очевидно, функциональная специфика вечерней газеты не просто взаимосвязана со специфической структурой мотивов потребления, но в значительной мере является ее следствием. При этом определяющими являются три